магазін, каб купіць, а прадаўшчыца – на смех: ці ты баба, герой вайны: Паказвай дакументы. І вярнулася старая дадому ў слязах. А тут і я зайшоў: што за слёзы? Аказалася, дыванок мог купіць толькі ўдзельнік вайны. Я кажу: ідзіце ў ваенкамат і вазьміце паперку на мужа – ён у вас за вайну колькі меў ордэнаў ды раненняў? Дак жа ён памёр? Ну і што? Удава ветэрана! Пайшла. А ў ваенкамаце, шукаючы дакументы на Сямёна, знайшлі і на яе паперкі, пагарталі: вы ж самі ўсю вайну былі на франтах? Узнагароды, нават баявая Чырвоная Зорка – ордэн? Вярнулася дадому – даведку ўзяць пасаромелася: які ж я, кажа, ветэран вайны? Ну, працавала на паштовым поездзе, пошту на фронт і з фронта, на фронт і з фронта, бамбілі нас, гарэў наш поезд, хавала ў дарогах сяброў, салдацікаў, але ж які я герой?.. Баба, як усе бабы... І па дыванок не пайшла. Пасекла сваіх курэй, склала ў сумку і паехала да Светкі ў Мінск.

Зноў спускаюся са свае зялёнае горкі, пераходжу вуліцу, спыняюся, гляджу ў вокны дома Сямёнаўны. Цяпер тут жывуць іншыя людзі. І ў доме суседнім – іншыя. Некалі жылі Марозавы, стары і старая, дом прадалі, а самі паехалі да дзяцей аж у Сібір. І з другога боку ад дома Сямёнаўны, у доме, дзе жыў стары Карагодаў, людзі новыя, настаўніца з дзяўчынкаю. Нікога, што за людзі, не ведаю. Але ж некалі і Сямёнаўну не ведаў, пакуль выпадкова не адкрылася. Думаў: баба і баба, а як адкрылася – колькі ахвярнасці, сціпласці, мужнасці! Гэтак кожны раз: прыедзеш на сваю радзіму, ідзеш па ёй ад дома да дома, і кожны дом, кожнае ў ім акно, кожнае дрэва мала сказаць – знаёмае, яно – сваё, блізкае, і на кожным кроку можаш чакаць, як зараз табе хтосьці ці штосьці адкрыецца, як адкрылася аднойчы Сямёнаўна – нечаканым слоўкам, пачуццём, вобразам, сюжэтам, як свайму чалавеку. Гэтакае бывае толькі на радзіме.

Праўда, яшчэ нядаўна нас усіх вучылі, што радзіма ў нас ад мора да мора, ад Калінінграда да Уладзівастока. І мы гэтаму верылі. І растрэслі па той вялікай краіне, што называлася СССР, вельмі шмат сваіх сыноў і дачок. Цяпер падыйдзеш да свае былой школы, паглядзіш на яе вокны, як у жывыя вочы, успомніш, які вялікі быў у нас клас, за трыццаць дзяўчат і хлопцаў, як усе, хто хацеў, паканчалі універсітэты, акадэміі, інстытуты, вышэйшыя вайсковыя вучэльні – дзе яны? Большасць – там, у нязмераных прасторах СССР. Жывыя ці мёртвыя?..

Ведаю і я ці не ўсе куточкі СССР, пабываў і на Далёкім Усходзе, і на Поўначы, і ў Сібіры, на Урале, у Сярэдняй Азіі, дзе толькі не вадзіла мяне мая журналісцкая ды пісьменніцкая душа. І ўсюды, забыўшы, што казалі мне мае настаўнікі, я адчуваў, што Сібір – радзіма для сібірака, Чукотка – для чукчы, Якуція – для якута, Волга – для рускага чалавека, а ў мяне, беларуса, радзіма адна – Беларусь, а ў Беларусі самае любае і святое месца тое, дзе нарадзіўся і вырас, дзе мой бацькоўскі дом і дзе магілы мамы і бацькі.

**ЛЯХОВІЧ** ***Ларыса Уладзіміраўна***, нарадзілася 13.6.1968 г., кандыдат гістарычных навук (2001). Працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры. Выйшлі з друку яе навуковыя працы па эканамічных, палітычных і культурных сувязях Беларусі і Францыі. Займаецца навукова-метадычнай распрацоўкай вучэбных дапаможнікаў і метадычнай літаратуры для сярэдняй і вышэйшай школы. Вядзе навукова-даследчую работу па гісторыі сваёй «маладой радзімы» – Крычаўшчыны. У гэтай кнізе змешчаны шэраг матэрыялаў аб падпольным і партызанскім руху ў раёне, якія выявіла і падрыхтавала да друку Л.У. Ляховіч.

**МАЗАЛЬКОЎ** ***Яўген Сямёнавіч***, нарадзіўся 17(30).9.1909 г. у Крычаве. Крытык,



Л.У. Ляховіч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ